Настаўніцкая газета
14 мая 2009 года

С. 3

# Майскае дрэва спадчыны продкаў

**На пачатку мая ў Мінску завяршылася III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераемнасці". Вядучыя спецыялісты па культурнай спадчыне вуснай традыцыі чалавецтва з Мінска, Санкт-Пецярбурга, Вільнюса, Кіева і Роўна падзяліліся вопытам выкарыстання ў XXI стагоддзі каласальнага эстэтычнага, этнаэкалагічнага і рэкрэацыйнага патэнцыялу, які закладзены ў знешне простых і знаёмых з дзяцінства звычаях, песнях і легендах славян і балтыйскіх народаў.**

Сёлета гасцямі навуковага форуму, наладжанага універсітэтам культуры і мастацтваў, сталі носьбіты традыцыі — легендарныя этнаграфічныя калектывы "Ананчыцы" і "Гута" і яе пераемнікі — маладыя спевакі і выканаўцы этнічнай музыкі на гуслях, беларускай дудзе, дыятанічна настроеных цымбалах і нават на такіх экзатычных для ўсходнееўрапейцаў інструментах, як ірландская валынка і флейта Пана.

Навукова-творчы праект, які ўключаў у сябе навуковую канферэнцыю "Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання", этнаграфічны канцэрт "Фальклор беларускай глыбінкі", майстар-класы вядучых спецыялістаў у галіне даследавання і пераймання ўсходнееўрапейскага народнага мастацтва, святочны канцэрт так званых постфальклорных гуртоў, быў прымеркаваны да Года роднай зямлі і праводзіўся пад эгідай Міністэрства культуры, Рэспубліканскай камісіі па справах ЮНЕСКА, Цэнтра захавання спадчыны вуснай традыцыі беларусаў.

На пленарным пасяджэнні былі заслуханы праграмныя выступленні вядучых айчынных і замежных фальклarыстаў, этнаінструментазнаўцаў, культуролагаў, у прыватнасці, Тамары Варфаламеевай, кандыдата мастацтвазнаўства, сябра навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры (Мінск), Ігара Мацieўскага, доктара мастацтвазнаўства, прафесара, члена-карэспандэнта Расійскай акадэміі навук, акадэміка Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі ААН (Санкт-Пецярбург), Іны Назінай, доктара мастацтвазнаўства, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (Мінск), Пятра Андрыйчука, прафесара, загадчыка секцыі народных інструментаў КНУКіМ, заслужанага работніка культуры Украіны (Кіеў) і іншых. У секцыйных пасяджэннях з удзелам беларускіх, літоўскіх, польскіх, украінскіх і расійскіх даследчыкаў уздымаліся праблемы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны на дзяржаўным і міжнародным узроўнях, бытавання аўтэнтычнага фальклору, метадалогіі і, у прыватнасці, сучасных методык даследавання фальклору, упісання традыцыйнай культуры ў сучасную адукацыйную прастору.

Этнаграфічны канцэрт "Фальклор беларускай глыбінкі", які за апошнія тры гады стаў традыцыйным для нашай краіны, сабраў аматараў каранёвага меласу беларусаў. Адным з яго хвалюючых момантаў было сумеснае выкананне спеўнай класікі гурта "Ананчыцы" — песні "Каваль" — вясковымі спявачкамі і маладзёжным калектывам "Ветах" у суправаджэнні беларускай дуды. Гэты эксперымент — вынік нядаўняга ўдзелу "Ананчыц" і "Ветаха" ў міжнародным фестывалі "Славянскае дрэва" ў Санкт-Пецярбурзе, дзе аўтэнтычныя спявачкі з Салігорскага раёна і калектыў Вячаслава Калацэя паспяхова рэпрэзентавалі Беларусь на шматлікіх пляцоўках форуму.

Надзвычай цікавымі сёлета былі майстар-класы вядучых спецыялістаў у галіне даследавання народных спеўных, інструментальных, харэаграфічных традыцый. Іх праводзілі Тодар Кашкурэвіч (беларуская дуда), Ірына Папова (паўночнарускія гуслі), Ірэна Страздзіене (літоўскі побытавы танец), Ірына Мазюк (беларускія спевы).

Сваёй наладжанасцю і канцэптуальнасцю парадаваў святочны канцэрт постфальклорных (гарадскіх, якія пераймаюць вясковую музыку) гуртоў.

**Эвеліна ШЧАДРЫНА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ